http://navinki.port5.com

НАВІНКІ

1 - 8 сакавіка 2002 №3(52) Ко[illegible] свабодны

Газэта «Навінкі» выходзіць зь лютага 1998 г. Зарэгістраваная ў Дзяржаўным камітэце па друку Рэспублікі Беларусь 23.02.1999 г. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі №1272. Заснавальнікі: П.Канавальчык, А.Новікаў, А.Мазур. Галоўны рэдактар Паўлюк Канавальчык. Падпісны індэкс 63439. Адрас для карэспандэнцыі: п/с 33, 220134 Менск, БЕЛАРУСЬ; E-mail: navinki@ring.by; Адрас рэдакцыі: г.Менск, пр.газ.«Известия», 9-143.

Нумар падпісаны да друку 28.02.2002г., а 23.59. Тыраж 4000 экз. Надрукавана з гатовых дыяпазітываў у друкарні ТДА «Знамение», г. Менск, вул. Кальварыйская, 24. Заказ №283

Навінкі ў тЭстах

Ці ў курсе вы апошніх падзеяў?

1. Адпаведна рэформе ДПС цяпер на аўтатрасах будуць дзяжурыць:
А) Толькі афіцэры
Б) Толькі крапавыя берэты й спецназ
В) Толькі сябры таварыства сьляпых і глухіх

2. У чым сэнс распачатай у краіне ваеннай рэформы адпаведна міністру абароны Мальцаву?
А) Падрыхтаваць армію да сучаснай вайны
Б) Падрыхтаваць армію да маланкавай вайны супраць НАТО
В) Падрыхтаваць армію да дзембелю

3. ЗША намераны ўвесьці санкцыі супраць Беларусі за тое, што Лукашэнка быццам таргуе з Садамам:
А) Ракетнымі ўстаноўкамі С-300, з дапамогай якіх можна зьбіваць стратэгічныя ракеты
Б) Смачнымі чыпсамі «Онега» с сырам і цыбуляй
В) Ныркамі ды іншымі органамі-трансплантантамі

4. Якое сьвята днямі адзначылі мусульмане сьвету?
А) Гадавіну нараджэньня Бэн Гурыёна
Б) Курбан-Байрам
В) Сусьветны дзень тэрарыста-камікадзе.

5. Што атрымалі хакеісты зборнай РБ за дасягненьні на Алімпіядзе?
А) Білеты на хакейны матч паміж ХК «Салават Юлаев» і «Юность»
Б) Шайбы з аўтографам Лукашэнкі
В) Абыцанкі-цацанкі

6. Дзе прапануе Пал-Палыч Барадзін зрабіць сталіцу саюзнай дзяржавы Расеі і Беларусі?
А) Хойнікі
Б) Гудэрмес
В) Смаленск

7. Хто хаваецца ў Панкінскай цясьніне (Грузія), якую вырашылі атакаваць ЗША?
А) Сябры руху Аль-Каіда
Б) Злосныя неплацельшчыкі за камунальныя паслугі
В) Грынч, які скраў Раство

8. Супраць чаго будзе пратэставаць 28 сакавіка Фэдэрацыя Прафсаюзаў?
А) Супраць паляваньня на мядзьведзяў панда ў Кітаі
Б) Супраць своечасовай выплаты заробкаў
В) Супраць парушэньня прафсаюзных правоў і забароны безнаяўнага пераліччэньня прафсаюзных складак

9. Якую сфэру паслугаў плянуецца перавесьці на платную аснову?
А) Службу ў арміі
Б) Мэдыцынскую дапамогу
В) Выхад у адкрыты космас

10. Без чаго праходзіла нефармальная сустрэча лідэраў краінаў СНД у Алматы?
А) Без гальштукаў
Б) Без базару
В) Без закускі й запівону

11. Што, адпаведна пастанове менгарвыканкаму, павінен мець пры сабе кожны сабака, каб ня быць усыпленым?
А) Наморднік, ашыйнік і костку
Б) Бірку з асабістым нумарам
В) Штамп зь менскай прапіскай

12. Што павысілася ў краіне з 1 сакавіка?
А) Курс рубля ў адносінах да даляру
Б) Узровень атмасфэрнага ціску
В) Мінімальная зарплата

Правільныя адказы: 1-А, 2-А, 3-А, 4-Б, 5-В, 6-В, 7-А, 8-В, 9-Б, 10-А, 11-Б, 12-В.

Спонсар для арміі

Вясновы прызыў пад пагрозай

Напярэдадні чарговага прызыву ваенкаматы раптам сутыкнуліся зь незвычайнай праблемай, якая здольная пахерыць узброеныя сілы краіны. Аказалася, што ў Міністэрства абароны скончыліся павесткі, а на новыя проста няма грошай. Ваенкаматы спрабуюць выправіць сытуацыю масавым абтэлефаноўваньнем патэнцыйных рэкрутаў. Аднак, паводле заканадаўства РБ, ваеннаабавязаны мусіць апавяшчацца выключна павесткай, якая павінна быць дастаўленая асабіста яму. Чым гэтая сытуацыя сьвеціць для прызыву, ня цяжка ўявіць: у прызыўнікоў ёсьць легальны шанец закасіць ад прызыву, проста не прыйшоўшы на прызыўны ўчастак. Павестка не была дастаўленая, а адпаведна, няма законнай падставы да санкцыяў з боку ваенкаматаў.

Разумеюць гэта й вайскоўцы, якія, як піша *Во славу Родины*, праяўляюць адпаведную кемлівасьць. Дапёршы, што ў сучасным грамадзтве нічога ня зробіш бяз спонсараў, яны пачалі зацята абтэлефаноўваць прадпрыемствы з просьбай забясьпечыць ваенкаматы патрэбнай колькасьцю павестак і іншай канцылярскай прадукцыяй для правядзеньня прызыву. Відаць, на новых павестках можна будзе сустрэць рэкляму, напрыклад, тэлевізараў «Гарызонт» або чыпсаў «Лявон» ●

АсьвЕта

У імя Айца...

Хабарніцтва, падхалімства, асабістыя сувязі... Якія толькі сродкі ня йдуць у ход, каб падтрымаць сапраўдную цягу да навукі. Як піша гарадзенская газэта *Биржа Информации*, вучні Пеўскага сельсавету Лідзкага раёну зьвярнуліся да А.Лукашэнкі з адкрытым лістом, у якім яны просяць бацьку пабудаваць для іх школу. Каб задобрыць прэзыдэнта, дзеці ў сваім лісьце абяцаюць багдыхану даць школе ягонае імя. Пакуль К.Маркса, 38 маўчыць у анучку, абдумваючы сытуацыю. Не пабудаваць школу, значыць праславіцца як вораг навукі й апошні цемрашал. Выдзеліць грошы на будаўніцтва – зноў пазбавіць беларускіх біятланістаў харчаваньня на якіх-небудзь чарговых гульнях.

Пакуль прэзыдэнт хістаецца, паддацца маніі велічы ці не, зьвярнем увагу чытача на той аспэкт, што ў некаторых гарадах праводзіцца скарачэньне сярэдніх навучальных установаў. Гэтак, напрыклад, у Слуцку прынятае рашэньне зачыніць дзьве школы, разьмеркаваўшы небаракаў-вучняў па бліжэйшых СШ. Бацькі гэтых лабатрасаў паднялі шухер, маўляў, дзетак пазбаўляюць права вучыцца. А мы, між іншым, раім бацькоўскім камітэтам у Слуцку хуценька ўзяць на ўзбраеньне ноў-хаў калег зь Лідчыны й назваць школы-ізгоі ў гонар Першага. У мясцовага ГарАНА рука не падымецца іх зачыняць, і дзеткі будуць вучыцца. А што да лідзкіх паборнікаў асьветы, то нашто бацьку тры школы ў свой гонар? Хіба што адна была б у імя Аляксандра, другая – Рыгорыча, а трэцяя – Лукашэнкі. Ці мы памыляемся?

Лас-Вэгасы местачковага маштабу

Бацькі беларускага адраджэньня заўседы ганарыліся тым, што беларусы мэнтальна абдзеленыя італьянскай эратаманіяй, каўкаскім авантурызмам і азіяцкім садызмам. Маўляў, Саваоф узнагародзіў нас талерантасьцю, рахманасьцю і памяркоўнасьцю.
Аднак ёсьць сымптом, што беларусы пазбавяцца гэтых сваіх якасьцяў.
На краіну абрынулася нашэсьце латарэйшчыкаў. Сёньня тыражы разыгрываюць ня толькі ў сталіцы, а ўжо нават у абласьцях, напрыклад, у Гомелі, Віцебску і Горадні. Чарга за раёнамі?
Каўкаскі авантурызм або гарачы раманскі тэмпэрамэнт ідуць на зьмену архаічнай абыякавасьці. Вінаватая ў гэтым новая палітыка дзяржаўных уладаў на месцах, якія вырашылі папоўніць мясцовы бюджэт праз абуджэньне пачуцьця азарту, што дрэмле ў нашым народзе.
Калі верыць газэце *Беларускі час*, мясцовая адміністрыцыя ў вялікіх колькасьцях друкуе латарэі і прымушае працоўных набываць латарэйныя білеты. Асноўны аргумэнт шантажу – пагроза нявыплаты прэміяў, затрымкі авансаў і г.д. Рабочыя ўжо ропшчуць, але яны яшчэ павінны быць шчасьлівыя, што ў іх гэтыя грошы проста так не забралі. Напрыклад, у сьнежні 2001 з пэнсіянэраў Гомелю зьнялі па тысячы рублёў на гарадзкую ілюмінацыю. Латарэя – гэта хоць нейкі шанец атрымаць прас або плэер. У сваю чаргу адміністрацыя, якая абувае людзей ня горш за трэст Пітэрса-Такера, можа паставіць справу на шырокую нагу. Напрыклад, ўсталяваць на кожным заводзе ў курылцы гральны аўтамат, каля прахадной напёрстачніка, а ў сталоўцы акдрыць казыно. А тым, хто адмовіцца – як казала гераіня «Брыльянтавай Рукі» – адрубіць газ ●

Монтэ Карла,
прафэсійны гуляка

Мёртвыя душы

На парозе павелічэньня сьмяротнасьці насельніцтва ўзмацнілася й канкурэнцыя паміж магільнымі кланамі, бо бізнэс па аказаньні рытуальных паслуг даўно лічыцца прыбытковай справай. Відаць, першай ахвярай разборак далакопаў і стаў дырэктар менскіх Усходніх могілак, які днямі быў арыштаваны «за хабарніцтва». Хто заказаў прэстыжнага магільшчыка сталіцы, невядома. Пачатае сьледзтва.

Пры пажары не званіць!

Во дзе буржуям сапраўды няма куды грошы дзяваць. Такая думка ўзьнікае пры аналізе чарговага інвэстыцыйнага экспэрымэнту на Барысаўшчыне. Справа ў наступным. Нейкая швайцарская кантора выдзеліла 300 тысяч даляраў для абсталяваньня дамоў сацыяльна незабясьпечаных сем'яў раёну супрацьпажарнымі сыгналізацыямі. Чым кіраваліся бацькі праекту невядома, аднак усё гэта можа ўскладніць і без таго нялёгкі сялянскі побыт. Ні табе ў хаце цыгаркі пасмаліць, ні печку запаліць – паганы заморскі прыбор адразу пачне свой кепіш. А гэта ў сваю чаргу пагражае штрафамі за беспадстаўны выклік пажарнай брыгады, што ляжа на бюджэт малазабясьпечаных ●



Даляры, эўрыкі, пружанкі...

У Пружанах пачалі эмісію ўласных грашовых знакаў

Беларусы, пытайцеся ў валютчыкаў і ў абменьніках пружанскія пружанкі! Дарэчы, як нам стала вядома, на сталічнай Камароўцы ўжо бачылі фальшывыя пружанкі. Таму перад тым, як набыць пружанскую валюту, уважліва паглядзіце купюру на сьвет. Там ані ў якім разе ня мусіць быць вадзяных знакаў ці мэталічнай стужкі! Банкнота павінна быць з простай паперы ў лінеечку з сшытку для вучняў, вытворчасьці добрушскай фабрыкі «Полеспечатъ».
Не лапухніцеся! ●

Пятро Пракаповіч,
валютчык на Цэнтры

Што робіць суайчыньнік, атрымаўшы на рукі кроўны заробак? Інстынкт выжываньня вядзе яго да бліжэйшага валютнага абменьніка. Трэба скінуць БРБ, пакуль іх ня злопала інфляцыя, і набыць $. Аднак сёньня пакупка баксаў выглядае відавочнай памылкай. У сьвеце працягваецца валютная вайна. Адпаведна праекту бюджэту Буша-малалеткі на ваенныя расходы ЗША адсьцёгваюць каля 240 млрд. даляраў. Гэта значыць, што прызнанай «у.е.» пагражае інфляцыя і дэвальвацыя. Дык што рабіць сярэднестатыстычнаму беларусу? Па старынцы скупаць золата?
Мы ж раім укладаць капіталы ў новыя грошы Пружанскага раёну — пружанкі. Як, вы ня ведаеце, што такое пружанкі? Калі давяраць *Советской Белоруссии* за 22.02.2002, зь нядаўніх часоў заробак у шэрагу калгасаў Пружанскага раёну пачалі выдаваць мясцовай валютай – чэкамі. Гэта паперкі, на якія ў мясцовым сельпо гарантавана можна набыць трохі хаўчыку. Выпускаючы пружанкі, мясцовыя ўлады намагаюцца сэканоміць крэдытныя сродкі.
Пружанская валюта – гэта сур'ёзна.

Забавы манэтарыстаў

Чалавецтва жыве ружовай марай пра часы, калі можна будзе кланаваць гены чалавека і, нарэшце, выводзіць новы тып гома-сапіенсаў. У Тэхасе падобным чынам ужо вывелі кошку. Але яшчэ больш сьмелы экспэрымэнт стартаваў гэтымі днямі ў нашай краіне. У Асіповічах міністар сацыяльнай абароны А.Морава разам з Сусьветным Банкам вырашыла вывесьці новы, дасканалы тып беларуса. Сэнс экспэрымэнту заключаецца ў тым, каб пазбавіць грамадзянаў генаў, якія выклікаюць паразытычныя настроі. Паразытычныя настроі – зуд беларуса. Кожны крывіч у душы марыць аб тым, як выклянчыць у дзяржавы нейкую ільготу, або атрымаць на халяву ад дзяржавы належныя яму па закону 60% мінімальнага пражытачнага бюджэту (зараз гэта прыкладна 37 000 вушастых).
Як сьцьвярджае міністар, натуральных ільготаў цяпер увогуле ня будзе (іх будуць башляць грашыма). Каб атрымаць грошы, трэба будзе прадаставіць па месцы прапіскі альбо навучаньня некаторую інфармацыю. Адпаведна інтэрвію А.Моравай у *Советской Белоруссии* гэтая інфармацыя павінна ў сябе ўключаць дадзеныя аб непасрэдных грашовых паступленьнях, грашовы эквівалент усіх відаў натуральнай дапамогі, якія патэнцыйныя даходы

атрымліваюцца ад рацыянальнага выкарыстаньня рухомай або нерухомай маёмасьці, каэфіцыент эфэкту сумеснага пражываньня ў сям'і, наколькі вы працаздольныя, ваш працаздольны патэнцыял і г.д. Відавочна, міма такой зачысткі ніводны гультай не праскочыць хаця б таму, што такую колькасьць даведак атрымаць простаму сьмертнаму немагчыма. Экспэрымэнт Моравай можна лічыць абсалютна ўдалым ●

Раман Ярашук

ПрацЯг тЭмы

«Балтика» судзіцца

Зноў кантора Тэймураза Балоева прыцягвае да сябе ўвагу грамадзкасьці. На гэты раз кіраўніцтва «Балтики» спрабуе адсудзіць укладзеныя кампаніяй 10,5 мільёнаў даляраў на «рэканструкцыю вытворчай лініі» піўзаводу «Крыніца». Між тым, як нам стала вядома з крыніц, набліжаных да кіраўніцтва «Крыніцы», уся гэтая вазьня з рэканструкцыяй піўзаводу была толькі танным трукам. Перш чым нешта рэканструяваць, «балтыйцы» развалілі 3 з 4 вытворчых ліній, чым значна скарацілі аб'ём вытворчасьці піва. Вызваленую піўную нішу адразу ж завалілі прадукцыя «Балтики», якая неўзабаве зь лішкам адаб'е свае мільёны.
Так гэта ці не, але «Крыніца» аказалася крайняй.

ЦарквА і бІзнэс

Дрэсыроўшчыкі духу

Таталітарная сэкта становіцца на службу карпарацыям

«Славься, компания наша родная,
Травами мир исцеляй!
Розой душистою в месяце мае
Пышно цвети, Гербалайф!»
(К.Ф. Канус, «Гимн компании Гербалайф», *Чудеса. Сенсации*, №2(10), 2002)

«Заходите, как мы рады вас видеть!» Гаспадары (ці арэндатары?) невялічкага офіснага памяшканьня па вуліцы Няміга сустрэлі мяне гасьцціннасьцю, аптымістычнай музыкай Макарэвіча і гіганцкімі ўсьмешкамі на румяных рожыцах. Сумненьні як выпарыліся: абяцаны маёй сяброўкай «гасьцявы трэнінг» адбудзецца менавіта тут. Аб гэтым сьведчылі і некалькі сьціплых афішак, якія стракацелі таямнічымі тэрмінамі кшталту «вяровачны курс», «рэбэфінг», «біяэнэргетыка»... У клясе бавіў час яшчэ якісь дзясятак незнаёмых мне індывідаў. Я адчуў сябе неяк няёмка: усе навокал сьмяяліся, абменьваліся сяброўскімі пацалункамі, карацей, пырскалі шчасьцем у розныя бакі. Адзінай, хто не паказвала свой карыес, была (калі не лічыць мяне) нейкая дзяўчына, што сядзела ў іншым баку залі. Як аказалася потым, толькі яна і я прыйшлі на «трэнінг» упершыню. Сярод гэтай супольнасьці разьняволеных і вясёлых асобаў мы выглядалі купкай закамплексаваных чмошнікаў. Трэба было альбо трусьліва бегчы з гэтага сьвята жыцьця, альбо паспрабаваць стаць гэткім як яны. Я пацеў і вагаўся. Але калі арганізатары раздалі анкеты з прапановай унесьці 250 у.е. за трохдзённы курс «духоўнага трэнінгу», першы варыянт перамог...
Духоўныя трэнінгі «ОТКРЫТЫЙ ФОРУМ», «ЛИДЕРСКИЙ КУРС», «ВЕРЕВОЧНЫЙ КУРС» і да т.п. зьявіліся ў Беларусі нядаўна, але ўжо набылі характар моды. Нягледзячы на амаль поўную адсутнасьць рэклямы (арганізатары аддаюць перавагу вуснаму інфармаваньню праз былых кліентаў, якія прыводзяць сваіх знаёмых, якія...), сотні беларусаў ужо заплацілі кіпы даляраў за абяцаную магчымасьць пашырыць свае духоўныя магчымасьці. Усе гэтыя трэнінгі суць расейскія разнавіднасьці праграмаў кампаніі LANDMARK EDUCATION CORP., штаб-кватэра якой знаходзіцца ў Сан-Францыска. Сайт кампаніі апісвае свае паслугі наступным чынам: «LANDMARK EDUCATION забясьпечвае тэхналёгію, якая дазваляе ўдзельнікам думаць і дзейнічаць па-за існуючымі стэрэатыпамі і рамкамі, як у прыватным жыцьці, гэтак і ў іншых сфэрах жыцьцядзейнасьці.» Пэрспэктыва заманлівая і, на першы погляд, не выклікае падазрэньняў. Аднак не сьпяшайцеся прадаваць спальны гарнітур, каб «пашырыць вугал свайго зроку».
Пасьля праведзенага «Навінкамі» расьсьледваньня аказалася, што пад макіяжам бяскрыўдных трэнінгаў асабістага і прафэсійнага росту хаваецца таталітарная сэкта, шчыльна зьвязаная з буйнымі карпарацыямі і нэалібэральнай ідэалёгіяй. Карані LANDMARK EDUCATION CORP. ідуць ад Рона Хабарда - графамана-фантаста, заснавальніка «навукі» дыянэтыкі і знакамітай Царквы Саенталёгіі, аб'яўленай небясьпечнай сэктай у большасьці краінаў Заходняй Эўропы. Сярод пасьлядоўнікаў Хабарда быў нехта Уорнэр Эрхард (сапраўднае імя Джэк Розэнбэрг) – гандляр патрыманымі аўто, які скраў і перафармуляваў ідэі свайго настаўніка, здобрыўшы апошнія ўсходняй экзотыкай (дзэн-будызм) і поп-псыхалёгіяй (Карнэгі і да т.п.). Эрхард стварыў праграму трэнінгаў E.S.T., якую спачатку плянаваў зарэгістраваць як царкву (каб, як і Хабард, пазьбегнуць падаткаў). Але камэрцыйная жылка «гуру» перамагла, і ў 70-я гады E.S.T. стаў надзвычай модным «духоўным трэнінгам» сярод тагачаснай амэрыканскай сярэдняй клясы, а ў 1985 годзеператварыўся ў магутную карпарацыю LANDMARK EDUCATION. Сам жа Настаўнік сыходзіць у цень, а саенталягічныя карані абвяргаюцца зь пенай на вуснах. Тым часам, шчупальцы гандляроў шчасьцем распаўсюджваюцца па ўсім глёбусе.
З ростам папулярнасьці прыходзяць кампраматы. Дамо мікрафон Рыку Росу (Rick Ross), вядомаму амэрыканскаму знаўцу сэктаў: «Я атрымаў сотні скаргаў ад былых кліентаў LANDMARK і іхных сем'яў. Мэтады кампаніі блізкія да прамыўкі мазгоў і кантролю сьвядомасьці. Яны патэнцыйна небясьпечныя і могуць прывесьці да сур'ёзных псыхічных расстройстваў. Нікому б не параіў...» Многія псыхіятры ўказваюць, што таталітарныя мэтады трэнінгаў (вялікія групы пад сто чалавек і ціск на «статкавы інстынкт», фактычная ізаляцыя на некалькі дзён у замкнутай супольнасьці, фізычныя абмежаваньні і падштурхоўваньне кліентаў да вэрбоўкі новых кліентаў) могуць весьці да маніі вялікасьці, параноі, дэпрэсіі і нэрвовых зрываў (American Journal of Psychiatry).
Гісторыя са зьяўленьнем у Беларусі яшчэ аднаго навамоднага культу была б банальнай і мала цікавай, калі б ня вязі, якія злучаюць духоўных трансфарматараў з карпарацыйным топ-мэнэджмэнтам. LANDMARK EDUCATION CORP. зьяўляецца сябрам шматлікіх амэрыканскіх бізнэс-асацыяцыяў (як, дарэчы, і вышэйузгаданая Царква Саенталёгіі) і супрацоўнічае з урадамі розных краінаў (напр., Новай Зэляндыі). Расейскім часопісам *Коммерсантъ Деньги* (№6, 20.02.2002 г.), «вяровачныя курсы» занесеныя ў сьпіс найбольш папулярных карпаратыўных трэнінгаў. Дарэчы, сярод спажыўцоў спірытуальных паслугаў сэкты менскі філіял Procter&Gamble. І гэты факт не выпадковы. Нішто не падыходзіць лепш да ідэалягічных патрабаваньняў сучасных карпарацыяў (поўная адданасьць і ідэнтыфікацыя сваіх інтарэсаў з «камандай», «гнуткасьць», індывідуальная адказнасьць, пастаянны рост прадукцыйнасьці і г.д.) як таталітарная філязофія «ФОРУМУ»: нічога ня мае сэнсу, усё ёсьць толькі індывідуальная інтэрпрэтацыя, галоўнае – умець ставіць мэту і дасягаць яе. Наша ідэнтычнасьць – гэта «псыхалягічны горб», які перашкаджае асабістаму посьпеху, «адкрытай» камунікацыі і працы ў Камандзе, ні мінулае ні будучыня не павінны мець аніякага значэньня.
У XVII ст. пратэстанцкія сэкты стварылі этыку клясычнага капіталізму. LANDMARK і да т.п. «гуру» спрабуюць зьляпіць катэхізыс нэалібэралізму. АМІНЬ! ●

Сёку Асахара

Генафонд шоў «Рэпрадуцэнт»

Кірхэ, кюхен, кіндэр – стыль сучаснай жанчыны

Самы вялікі падарунак беларускім жанчынам напярэдадні 8 сакавіка зрабіў родны Прэзыдэнт. Яшчэ 4 студзеня 2002 году, калі ўся краіна корчылася ў сутаргах постнавагодняга бадуну, А.Лукашэнка паставіў закаручку пад тэкстам Закону «Аб дэмаграфічнай бясьпецы». Закон павінен радыкальным чынам перагледзець функцыю жанчыны ў соцыюме і ўзьняць звычайную беларускую бабу да ганаровага статусу абаронцы нацыянальна-дэмаграфічных інтарэсаў. Нацыянальна-дэмаграфічныя інтарэсы, адпаведна закону, гэта збалансаванасьць дэмаграфічных інтарэсаў дзяржавы.

Сёньня гэтыя сьвятыя інтарэсы ўшчэнт разбалансаваныя. Колькасьць беларусаў, што спускаюць дух, большая за тых, хто выкарасквaецца з улоньня маці. Калі такая тэндэнцыя працягнецца, то ў дэбюце наступнага стагодзьдзя ціха склеіць кеды апошні з нашчадкаў гордых крывічоў. Збалансаваць дэмаграфічныя інтарэсы здольныя толькі кабеты, чые арганізмы маюць органы-члены, неабходныя для нараджэньня й выношваньня чалавечага эмбрыёну. Пытаньне ставіцца рубам: жаночая яйцаклетка не павінна расслабляцца, а выдаваць на-гара трайную норму зародышаў.

Блукаючы ў джунглях артыкулаў арданансу ад 4 студзеня цяжка зразумець, якім чынам дзяржава зьбіраецца прымусіць жаночую матку пахаць па-стаханаўску. Фармулёўкі закону настолькі туманныя і супрацьлеглыя, што ўзьнікае пытаньне: ці ня складзеныя яны чалавекам з дыхатаміяй галаўнога мозгу.

Адна частка прававога акту – відавочны плягіят праграмы сацыялістаў. Яна разьлічвае на тое, што жанчына зачасьціць у радзільнае аддзяленьне, калі будзе матэрыяльна забясьпечаная і максімальна свабодная. У законе гаворыцца аб неабходнасьці паляпшэньня статусу жанчыны на рынку працы, аб забесьпячэньні роўнасьці правоў жанчын і мужчынаў.

Другая палова закону кардынальна супярэчыць першай. Тут музай аўтарам закону паслужыў асабіста яфрэйтар Шыкльгрубэр, які таксама меў нацыянальна-дэмаграфічныя інтарэсы.

Пасьля прыходу да ўлады нацыстаў Гітлер заявіў: «праграма нацыянал-сацыялістычнага жаночага руху мае толькі адзін пункт. І гэты пункт – дзіця». Анонсам барацьбы NSDAP за дэмаграфічную бясьпеку стаў закон супраць беспрацоўя (Gesetz zur Verminderung der Arbeitlosigkeit). Адна зь ягоных мэтаў – абмежаваньне грамадзкай ролі жанчын. Законам уводзіліся квоты для паступленьня студэнтак у ВНУ, жанчынам было забаронена працаваць юрыстамі, і ў адміністрацыі. Ім заставалася толькі адно месца – быць добрай супругай і клапатлівай маці. Не выпадкова фюрэркай афіцыйнай жаночай арганізацыі Frauenschaft была абраная Гертруда Шольц-Клінк. Яна ўвасабляла сабой ідэал нямецкай жанчыны, бо мела 11 дзяцей. У 1934 была ўведзеная ўзнагарода для матакгераіняў «Крыж нямецкай маці». За 4 дзіцяці давалі бронзавы, за 6 – срэбны, за 8 карапузаў – залаты. З 1938 нежаданьне супругаў паласкаць распашонкі стала крыміналам, г.зн. Ehescheidunggesetz. Акрамя таго, нацыстаў цікавілі ня толькі дзеці, а выключна расава чыстыя дзеці. Адпаведна Нюрнбэргскім законам забараняліся любыя шлюбы і кантакты з расава-непаўнавартымі. У 1934 абвешчаная праграма па стэрылізацыі хворых жанчынаў. Усяго было стэрылізавана 100 тысячаў чалавек.

Закон РБ «Аб дэмаграфічнай бясьпецы» ў некаторых фрагмэнтах недалёка адышоў ад Ehescheidunggesetz. Цяпер кожная беларуска павінна тужыцца думкай, як патачыцца з мужыком і нараджаць Радзіме паболей сыноў. Артыкул 11: «Адной з асноўных формаў рэалізацыі Закону зьяўляецца фармаваньне ўмоваў, якія садзейнічаюць павышэньню асноўных паказчыкаў рэпрадукцыйных установак жанчынаў у доўгатэрміновай дэмаграфічнай пэрспэктыве.

Для ўздыму каэфіцыенту нараджальнасьці плянуецца, як у Нямеччыне, намёртва прывязаць жанчыну да сям'і. Законам перадугледжаная «пераарыентацыя сыстэмы грамадзкіх і асабістых каштоўнасьцяў на сям'ю зь некалькімі дзяцьмі і абодвума бацькамі, якія састаяць у першым шлюбе,узмацненьне прыярытэтнасьці яе інтарэсаў у сацыяльнай палітыцы».

Прымусіць 20-гадовую сасалку забіць на кар'еру, на вучобу і прысьвяціць сябе бразготкам і памперсам павінна ня толькі прапаганда сямейных каштоўнасьцяў. У артыкуле 11 гаворыцца аб «спалучэньні працоўнай дзейнасьці з выкананьнем сямейных абавязкаў». Гэта ксэракопія нямецкага Gesetz zur Verminderung der Arbeitlosigkeit, які прыраўноўваў мацярынства да формы працы.

Паралельна будзе ўзмоцненая барацьба супраць мігрантаў. Закон прадугледжвае «аптымізацыю зьнешніх і ўнутраных міграцыйных плыняў насельніцтва. Прывядзеньне ў адпаведнасьць правоў эмігрантаў, якія атрымалі адпаведны прававы статус з інтарэсамі дзяржавы ў пытаньні іх рассяленьня і добраўпарадкаваньня. Плюньце мне ў вочы, калі гаворка ня йдзе пра стварэньне новых гета. Ніводная каўкаская або віетнамская храмасома ня трапіць у кроў беларусаў!

Як бачым, з такімі законамі выжывальнасьць нацыі забясьпечаная на ўсе сто. Паміраючы ад амартызацыі арганізму, выклікаңага частымі родамі, беларускай кабеце ёсьць чым сябе цешыць. Яна самааддана заклала сваё цела на алтар Нацыі! Хіба гэта ня варта жыцьця!

Каб лепей падрыхтавацца да будучых нацынальна-дэмаграфічных бітваў, мы прыпадносім беларускай жанчыне настольную гульню **«Рэпрадуцэнт»**. Гуляючы ў яе, вы лепей адчуеце сябе выратавальніцай генафонду, барацьбіткай за пазытыўны сумарны каэфіцыент нараджальнасьці ●

Р Э К Л Я М А

Правілы гульні

У гульні могуць удзельнічаць колькі заўгодна чалавек. Станьце на поле «Дасягненьне полавай сьпеласьці» і пачынайце па чарзе рухацца адпаведна колькасьці фішак, якія выпадаюць на кубіку. Мэта гульні – нарадзіць 10 дзяцей і атрымаць імя нармалёвай беларускай жанчыны. Каб нарадзіць немаўля, вам патрэбна трапіць на поле «Полавы акт». Патрапіўшы на гэтае поле, кіньце яшчэ раз кубік: калі ў вас выпаў няцотны лік, вы не зацяжарылі. Ідзіце далей. Калі выпаў цотны – вас ванітуе, цягне на салёненькае – вы цяжарныя. Адпраўляйцеся на ўнутранае кола і кіньце яшчэ раз кубік, каб даведацца, чым скончылася вашая цяжарнасьць: 1 – у вас нарадзілася адно дзіця, 2 – двое дзяцей і 3 – адпаведна тройня. Віншуем! Калі выпалі 4, 5 або 6 – гэта значыць аборт, выкідыш і нараджэньне Квазімоды. Нашыя спачуваньні. Адпраўляйцеся далей у пошуках наступнага полавага партнэра. Той, у чыёй сям'і будзе 10 сарванцоў – пераможца.

СТАРТ

Віншуем з полавай сьпеласьцю! Час рэпрадукцыйных рэкордаў! Мэта гульні – даказаць, што ты сапраўдная беларуская жанчына. Зрабі гэта! Нарадзі 10 дзяцей, выратуй нацыю ад дэмаграфічнага крызысу! Наперад!

Сэктар «Клянаваньне»

Вас абралі для мэдыцынскага экспэрымэнту, які, як ні дзіва, скончыўся ўдала. Усе вашыя дзеці прайшлі кланаваньне. Такім чынам, іх стала ў 2 разы болей. Так трымаць! (Дзяцей х 2)

Сэктар «Полавы акт»

Зьдзейсьнілася! Спэрматазоід пачаў сваё падарожжа. Кіньце кубік. Калі выпадзе цотны лік, то гінэколяг прызнае вас цяжарнай. Адпраўляйцеся ва ўнутранае кола «Раддом». Калі няцотны – рухайцеся далей.

Сэктар «Плястычная хірургія»

Нечакана вы зразумелі, што крыніца вашых правалаў у дэмаграфічным спаборніцтве – вашая брыдкая рожа. Ніводны самец не клюе на такую кікімару. Адзінае выйсьце – зрабіць плястычную апэрацыю. Аднак гэта каштуе грошы, таму прадайце адное дзіця гандлярам органамі і за атрыманыя грошы станьце каралевай прыгажосьці. (-1 дзіця)

Сэктар «Радыяцыя»

Вы зьелі радыяцыйныя ягады і пачаставалі імі дзяцей. Якая недарэчнасьць! У выніку ў вашых дзяцей абвастрыліся ўсе магчымыя хваробы. Усе вашыя дзеці памерлі. (зьлятайце на 0)

ДЭМАГРАФІЯ

Сэктар «Інкубатар»

Віншуем! Паводле дадзеных мэдыцынскага агляду, які праходзяць усе жанчыны рэпрадукцыйнага ўзросту, вы залічаныя ў групу рэпрадукцыйнага рэзэрву. У выніку штучнага асемяненьня вы далі жыцьцё 5 немаўлятам. (+ 5 дзяцей)

Сэктар «Полавы акт»

Зьдзейсьнілася! Спэрматазоід пачаў сваё падарожжа. Кіньце кубік. Калі выпадзе цотны лік, то гінэколяг прызнае вас цяжарнай. Адпраўляйцеся ва ўнутранае кола «Раддом». Калі няцотны – рухайцеся далей.

Сэктар «Лесбійскае каханьне»

З вамі адбылося нешта жудаснае. Пасьля прачытаньня *Forum Lambda* вы адчуваеце, што мужчынскае цела вас больш ня вабіць. Вам патрэбныя аднаполавыя ласкі. Нажаль, дзяржава не заахвочвае гэткія вычварэнствы, вы арыштаваныя службай дэмаграфічнай бясьпекі і адпраўленыя на год у Цэнтар полавай карэкцыі. Прапусьціце адзін ход.

Сэктар «Харчаваньне»



У выніку чарговага эканамічнага прарыву дзяржава скараціла сацыяльную дапамогу маці. Па вашай шматлікай сям'і нанесены цяжкі ўдар. Галодныя дзеці ныюць і патрабуюць ежы. Адзін зь іх давёў вас да псыхічнага зрыву – вы яго забілі. (-1 дзіця)

СЭКТАР «РАДДОМ»

1

Гэты бэбі – прадукт вашай працы. Шкада, што толькі адзін, але мы спадзяемся, што гэта толькі пачатак вашай дэмаграфічнай кар'еры. (+ 1 дзіця)

2

Што гэта за цудоўныя ружовыя блізьняты? Яны так міла равуць і пісяюцца! Гэта ж вашыя дзеткі! Вашая двойня! (+ 2 дзіцяці)

3

Віншуем, у вас тройня! Прыходзьце да нас яшчэ. (+ 3 дзіцяці)

Сэктар «Цынкавая труна»



Кожная маці павінна быць падрыхтаваная да гэтага. Адзін з вашых сыноў, які праходзіў вайсковую службу, скончыў жыцьцё самагубствам, ня вытрымаўшы зьдзекаў дзядоў. Вы атрымалі цынкавую труну. Прыміце гэты факт мужна – ён загінуў за Радзіму. (- 1 дзіця)



З каго рабіць жыцьцё маладой асобе жаночага полу: з Мадонны? Прынцэсы Дыяны? Кортні Лав? Кіньце дурное. Ідэал жанчыны – гэта не заакіянскія фэміністкі, а добрасумленныя хатнія гаспадыні. Беларуская формула жаночага шчасьця – стая дзяцей, сыты муж і сьлязьлівыя лаціна-амэрыканскія сэрыялы па Першаму Нацыянальнаму Каналу. Пасьля такога жыцьця і паміраць лёгка...

Сэктар «Полавы акт»

Зьдзейсьнілася! Спэрматазоід пачаў сваё падарожжа. Кіньце кубік. Калі выпадзе цотны лік, то гінэколяг прызнае вас цяжарнай. Адпраўляйцеся ва ўнутранае кола «Раддом». Калі няцотны – рухайцеся далей.

Сэктар «Жаночая кансультацыя»

Прыйшоў час абавязковага штогадовага мэдыцынскага агляду ў мясцовым аддзяленьні жаночай кансультацыі. Прайдзіце ўсе патрэбныя працэдуры і праслухайце лекцыю на тэму аб шкоднасьці кантрацэптываў. Прапусьціце ход.

Н-да, замест таго, каб даваць краіне новых грамадзянаў, вы аддалі перавагу аборту. Калі- небудзь вас за гэта пакараюць. Вашае цела належыць дзяржаве, а ня вам! Вяртайцеся ў зьнешняе кола.

5

Вы нявартая насіць ганаровае імя беларускай жанчыны. Цяжарнасьць азначае дысцыпліну, а не хаджэньне па клюбах. У выніку, надзея ўсёй краіны змылася ва ўнітаз – у вас выкідыш. Ганьба! Вяртайцеся туды, адкуль прыйшлі.

6

Лепей бы вы здохлі, чым убачыць такое! Гэта ж трэба нарадзіць ад нелегала-эмігранта! Раней за такія рэчы стралялі. Нараджэньне гэткіх уродцаў ня йдзе вам у залік. Вяртайцеся назад.

Сэктар «Рак маткі»



Дагуляліся! У вас знайшлі рак маткі. Вас чакае доўгае і нуднае лячэньне. Кіньце кубік і высьветліце, колькі хадоў вам прыйдзецца прапусьціць. Не сумуйце, лепш пайсьці пад нож хірурга, чым быць бясплоднай – большай ганьбы для жанчыны немагчыма прыдумаць.

Сэктар «Полавы акт»

Зьдзейсьнілася! Спэрматазоід пачаў сваё падарожжа. Кіньце кубік. Калі выпадзе цотны лік, то гінэколяг прызнае вас цяжарнай. Адпраўляйцеся ва ўнутранае кола «Раддом». Калі няцотны – рухайцеся далей.

Сэктар «Рынак дзіцячай працы»

У вас цэлая кагорта дзяцей, а іх няма ўва што апранаць. Дапамога дзяржавы мізэрная. Што рабіць? Цудоўнае выйсьце – аддаць 1-2 вашых пітомцаў у часовае рабства вырабніку порнафільму. Нічога страшнага, вы здаровая жанчына, народзіце новых. (– 1 дзіця)

КЛІМАКС

Адбылося самае страшнае, што можа здарыцца з жанчынай – вас напаткаў клімакс, вы больш ня можаце мець дзяцей. Такая як вы непатрэбная грамадзтву. Пакіньце гульню і чалавецтва.

Мэмарыял у Курапатах

Як будзе выглядаць урочышча пасьля перамогі адраджэнцаў?

ПРАВАСЛАЎНАЯ ЦАРКВА

КАТАЛІЦКІ КАСЬЦЁЛ

СЫНАГОГА

КРЫВІЦКІ КУРГАН

ПЛЯНЭТАРЫЙ

Пакуль курапацкія абаронцы змагаюцца з будаўнікамі кальцавой аўтастрады, баронячы кожны мэтар урочышча ад бульдозэраў, у цёпленькіх апазыцыйных кабінэтах сьпеюць чарговыя шызовыя пляны па «дабраўпарадкаваньні мэмарыялу Курапаты». Напрыклад, набудаваць там рознага кшталту храмаў, малельных дамоў, вечных агнёў ды іншых культавых пабудоваў розных веравызнаньняў у такой колькасьці, што, відаць, прыйдзецца пусьціць пад бэнзапілу ўвесь курапацкі лес. Дастанецца ўсім па малельні – і праваслаўным з каталікамі (як ні як, традыцыйныя канфэсіі), і паганцам (большасьць сёньняшніх абаронцаў прытрымліваюцца прашчураўскіх забабонаў), і юдзеям (добрая частка костак належыць яўрэям). Але ці прадугледзелі паважаныя ўшанавальнікі Курапатаў, што большасьць ахвяраў сталінскага генацыду былі атэістамі (як і пераважная колькасьць сучасных беларусаў), і што яны таксама маюць права на вечную памяць? Прапануем вам эскізы храмавых збудаваньняў, што варта ўзьвесьці ў Курапатах, якія задаволяць прыхільнікаў практычна ўсіх сьветапоглядных дактрынаў.

Bucks, Drugs and Rock' n' Roll

Ну і хто будзе спрачацца, што з помпай пахаванай год таму «Рок-Каранацыі» прыйшоў кірдык? Я першы скажу – не! Наадварот, перафразуючы Юрася Цыбіна, эксгуматара фэсту, яна выйшла на якасна новы ўзровень. Нарэшце ў задзе засталіся нестабільныя часы, калі кароны давалі патлатым рокерам або паціпу альтэрнатыўным панкам. Цяперашні ж Рок-кароль 2001 году – Алесь Суша, прад'юсэр і бізнэсмэн. Ён увогуле не сьпявае, ня грае на музычных інструмэнтах і нават не трасе балтом падчас экстравагантных шоў. Ён робіць значна больш важную рэч – адсьцёгвае капусту.

Бяз бабак сучасны рок-н-рол – поўны сакс. Казачкі пра крутое бескампраміснае і бескарысьлівае мастацтва даўно пакінутыя ў пясочніцы. Апошнія пяць гадоў, падымаючы ў руках карону, рокеры скардзіліся не на адсутнасьць кантакту са слухачамі, не на творчы застой, а... на недахоп у краіне шоў-бізнэсу! Ясна, што ў такіх раскладах нічога новага і крутога ў рок-н-роле чакаць не даводзілася. Калі асноўны стымул лабаць – жаданьне не працаваць, а на кішэню атрымліваць, дык ці варта зьдзіўляцца той колькасьці рок-халтуры, якую штогод выплёсквала Каранацыя? А вось любімы герой рок-тусоўкі Алесь Суша клапоў не гвалтаваў, і ўжо чатыры гады знаходзіў бабкі на розныя супольныя праекты. Іншымі словамі, сабралася шобла рокераў, выканала калядныя песенькі, а Суша ўжо стаіць і баблом шуршыць. За гэта яго і любілі. «Нічаво!» – казалі музыкі, што некаторыя «старыя песьні аб галоўным» гурты ў свае сольныя канцэрты пасаромеліся б уключыць. Вядома ж, толькі такі карысны чалавек і мог стаць героем нацыянальнага шоў-бізнэсу. У барацьбе за галоўную рок-карону сур'ёзную канкурэнцыю Сушы аніяк ня мог скласьці бізнэс-дуэт халтуршчыкаў з БМА ды папсовага лэйблу BULBA RECORDS. У далейшым, сымболем каранацыі можа стаць Крышталёвы бакс, які будуць уручаць у намінацыях «за лепшае прад'юсаваньне», «за бізнэс-плян году», «за буйнейшы грашовы ўнёсак у беларускі рок-н-рол». Канчатковае пазбаўленьне фальшывай «альтэратыўнасьці» і «нефармальнасьці», поўная шчырасьць перад публікай – вось галоўныя дасягненьні ўваскрослай Каранацыі. І гэта сапраўды рашучы крок ●

Санітар, рок-гільятынатар

Р Э К Л Я М А

КультУра спажывАньня

Чарнілы як сродак самаадукацыі ў Беларусі

«Атрута, кажуць дактары.
Ня вер, пляменьнечак, бяры»
(з фальклёру)

Калісьці СССР быў самай чытаючай краінай у сьвеце. А зараз айчынныя СМІ ў адзін голас сьцьвярджаюць нібыта ўзровень культуры і адукацыі імкліва зьніжаецца. Ці гэта так на самой справе?

Вядома, клюбы па інтарэсах, тэматычныя вечары, дабраахвотна-прымусовыя мерапрыемствы па месцы вучобы і працы ня маюць ранейшай папулярнасьці. Зацягнуць рабочага паглядзець на сталічнага мудака, паслухаць лекцыю пра жыцьцё на Марсе, паўдзельнічаць у лыжных спаборніцтвах здольныя толькі дармавая пляшка ці дадатковы адгул.

А прымусіць чалавека двойчы на тыдзень скакаць голым у палонку, плесьці макрамэ з плястыкавага шнуру, удзьмуць пад хвост пародзістаму кату ўвогуле не магчыма. Значная, калі ня большая, частка насельніцтва ў вольны час аддае перавагу не музэям і народным промыслам, а культпаходам у віна-гарэлачную краму.

Бадай, ніхто гэтак не клапоціцца пра кругагляд народу як вытворцы алькагольнай прадукцыі. Сышлі ў нябыт аднолькавыя найменьні пладова-ягадных вінаў і пенамыйных сродкаў: «Яблычнае», «Сунічная паляна», «Абрыкосавае». Цяперака ўсе чарнілы з аднаго крану, а назва кожнага – паэма. Цудоўны камплект для штодзённага ўжываньня ствараюць «Вечерний звон», і «Напиток винный Утренний». «Калядное», «Вечарніцы», «Купальскае», – знаёмяць з народнымі традыцыямі, абрадамі, абуджаюць нацыянальную сьвядомасьць. На этыкетках напояў «Речица», «Прыпяць» адлюстраваная прыгажосьць родных краявідаў.

Атрымаць элемэнтарнае ўяўленьне пра архітэктурныя і гістарычныя помнікі вам дапамогуць чарнілы наступных гатункаў: «Могилевское (зьмешчаная выява старога будынку вакзалу), «Стэла» (помнік Радзімы-маці на Савецкай плошчы Магілёву, у прастамоўі проста баба), клясычная «Белая вежа».

«Асоль», «Руслан», «Гусарская баллада», «Казанова» адкрываюць сьвет мастацтва і жывапісу. Рэпрадукцыі карцін Васьняцова, Рэпіна і інш. Бутэлечныя этыкеткіс можна выкарытоўваць на занятках па выяўленчым мастацтве ў школах, тэхнікумах, ВНУ. Пачуем «Раксалана», «Вікторыя», «Волшебная флейта» – і на душы адразу робіца хораша, узьнёсла, аднекуль з далечыні наплываюць фантазіі-ўспаміны.

Для алькаголіка ўвогуле характэрная ідэалізацыя ўласнай мінуўшчыны. Кульнуўшы чарку, кожны зь іх ператвараецца ў палкоўніка Ю. прафэсара, чэмпіёна алімпійскіх гульняў. Ніхто не перашкодзіць яму гадзінамі распавядаць пра пасады, званьні, посьпехі, узнагароды, якіх ніколі не было.

Яшчэ далей у справе самаадукацыі і ўліку псыхалягічных асаблівасьцяў гарамадзянаў «постасавецкай прасторы» пайшлі вытворцы гарэлкі «Товарищ», надрукаваўшы на этыкетцы ня толькі сымболіку савецкіх часоў, але й вершы:

«Водка «Товарищ» крепче и чище.
Пей на здоровье «Товарищ»,
Дружище!»

Частуйся, сінюга даражэнькі, успамінай савецкае ўчора, трэніруй памяць, выхоўвай мастацкі густ.

А вось сярод найменьняў дарагіх вінаў ужо няма такой рамантычнасьці, разнастайнасьці, вышыні палёту творчай думкі. І ў гэтым няма нічога дзіўнага. «Монастырское», «Монастырская изба», «Секрет старца», «Заговор монахов», «Тайная вечеря», «Слеза монашки» і г.д.

Вядома, сталыя аматары такога асартымэнту звычайна п'юць не за свае. А таму адчуваюць павышаную патрэбу ў атрыманьні сумленьня, супакаеньня душы. Нажаль, злоўжываньне новым спосабам малітвы садзейнічае хуткаму пераходу з «Тайной вечери» на «Вечерний звон».

Як бачым, лікёра-гарэлачная прамысловасьць літаральна за некалькі гадоў ператварылася ў інтэлектуальную галіну народнай гаспадаркі. Так што, слава беларускім выпівохам, самым чытаючым у сьвеце.

Экс-лібрыс

Прыём макулатуры

Міжнародная кніжная выстава-ярмарка, якая праходзіла ў менскім Палацы Мастацтваў 26-28 лютага, як заўсёды зьдзіўляе сваёй маштабнасьцю й празьмернай пампезнасьцю. Кніжная паліца ў «культурным доме трэцяга тысячагодзьдзя» нагадвае савецкія крышталёвыя сьценкі ці малінавыя пінжакі й залатыя ланцужкі «новых рускіх». Кніжныя вокладкі блішчаць як новы грош, а тытулы модных аўтараў сьведчаць аб эрудыцыі гаспадара і ўзроўні ягонай дасьведчанасьці ў культурным жыцьці. Дэмакратычны элемэнт на такіх выставах – тое, што ў натоўпе лягчэй можна нешта скрасьці, чым і карыстаюцца спрытныя наведнікі, каб «апраўдаць» кошт уваходнага квітку. Тэматыка большасьці кнігаадзінак прысьвечаная банальным дэтэктывам ды мэлядрамам. Найбольшы інтарэс прадстаўляе тое, што прэзэнтуецца па-за праграмай: не гарыпотэры (рэклямных плякатаў якіх выстаўлена аж некалькі экзэмпляраў ад розных выдавецтваў), не акуніны, пялевіны і марыніны, а, напрыклад, Зялёная кніга Муамара Кадафі, якую прэзэнтаваў Цэнтар арабскай культуры ў Менску.

Вядомы сталічным кнігалюбам агент па продажы кніг і вулічны гандляр Алесь Туровіч – калісьці малады паэт, а сёньня натхнёны спажывец вэрмуту – на гэтай выставе выступае ў якасьці госьця і пакупніка, а не прадаўца: «Асабіста мяне прыкалола кніга выдавецтва «Хата» «Селекционные и генетическае осннoвы выведения белорусской мясной породы свиней» Л.А.Фядорчанкі і Р.І.Шэйкі. Цікава, што побач на паліцы знаходзіцца кніга пад назвай «Пагоня ў сэрцы тваім і маім». Відаць, выгадаваныя пад знакам «Пагоні» сьвіньні-патрыёты будуць тлусьцець і набіраць вагу толькі на радзіме, а на чужыне будуць пухнуць і дохнуць, калі ім толькі не чытаць «Мой родны кут».

Расейскае выдавецтва «Граница» выступіла з кніжкай пра свайго любімага прэзыдэнта Пуціна, а іхныя беларускія калегі не пасьпяшаліся выставіць у адказ аналягічнай прадукцыі. Шмат разнастайных дапаможнікаў для тых, хто жадае весела і карысна правесьці час – пазаймацца сэксам ці павялічыць аб'ём бюсту (апошнім, дарэчы без нагляду лекара займацца небясьпечна, бо магчымыя й пабочныя эфэкты – павелічэньне аб'ёму вушэй ці адвісаньне ніжняй губы).

А ўвогуле, на думку прадстаўніцы арабскага цэнтру, культурная сытуацыя ў Беларусі можа кардынальна зьмяніцца ў лепшы бок, калі пры цэнтры пачнуць дзейнічаць курсы арабскай мовы і беларусы прачытаюць Зялёную Кнігу справа налева, як яна й была напісаная.

Парк Чалюскінскага пэрыяду

Хто быў у Парку Чалюскінцаў, той ведае, што нязьменным інтэр'ерам гэтай зоны адпачынку зьяўляюцца тарчкі і алканаўты. Ня дзіўна, што чытачы *Минского Курьера* даўно дастаюць старшыню Першамайскага райвыканкаму сталіцы (як раз тут і знаходзіцца парк) І.Манкевіча з пытаньнем, калі ж у менскім Булонскім лесе будзе наведзены парадак. Раённы галава натуральна сказаў, што сытуацыя пад кантролем, што рыхтуецца кардынальная перабудова, у прыватнасьці, ад адной фірмы паступіла цікавая прапанова — стварыць на любімым месцы адпачынку менчукоў «Парк Дыназаўраў». Бедны Манкевіч! Пудзіла тыраназаўра не адпугне наркаманаў, а наадварот узмацніць іх нездаровы інтарэс да Чэлюсьцяў (гэтак на мясцовым арго называюць парк). Уявіце сабе, які можна атрымаць прыход, калі пад кайфам натыкнуцца у зарасьцях каля Парк-клюбу на птэрадакцеля, або ігуанадона. Нішцяк! Прайграюць ад рэформаў толькі рэспэктабэльныя менчукі, якім за ўваход у прыватызаваны парк дагістарычнай фаўны прыйдзецца башляць kроўныя лавэ ●

Сыд Вішэз

Do It Yourself or DIE!

З болем у сэрцы павінны паведаміць пра блізкую сьмерць удзельнікаў гурту CONTRA LA CONTRA, якая чакае іх падчас заплянаванага канцэртнага туру. Тур працягнецца з 7 сакавіка па 13 красавіка. За гэты пэрыяд музыкі дадуць 38 канцэртаў у розных гарадах Эўропы, самаадданa склаўшы галовы дзеля разьвіцьця панк/хард-кор сцэны Беларусі. Ня вытрымаюць маладыя натхнёныя сэрцы працоўнага напружаньня ды нечалавечай эксплюатацыі з боку заходняга шоў-бізнэсу. Глыбока смуткуем з выпадку заўчаснага заканчэньня такой шматабяцаючай творчай кар'еры й выносім самыя шчырыя спачуваньні фанатам. Саша, Дзіма, Жэня, Васіл... – чатыры рубцы на сэрцы беларускага хард-кору. Ніколі ўжо ня чуць нам вашай антысацыяльнай лірыкі...

ЛЕпшы падарУнак!

Navinki Home Video прэдстаўляют СЛУЧАЙ З ПАЦАНОМ.

Блізка Каляды і Новы Год

Юра, нармальны пацан з раёна, сорыцца са сваёй малой. У поіске душэўнага спакойствія он рашает устроіцца как усе на работу. Аднака на пуці Юры вазьнікает прэкрасная незнакомка Насьця, акцівістка адной зь дэмакрацічэскіх арганізацый. Юра ўзнает, што ў стране сушчэствует какая-та апазіцыя, каторая борецца з какой-та там дзіктатурай. Сам таго ня зная, главны герой пападает у самую гушчу паліцічэскіх інтрыг...

Усім, хто жадае набыць фільм на відэакасэце, просьба зьвяртацца праз нашыя кантакты:

Адрас: 220134, Менск, п/с 33
E-mail: maryska@tut.by

СЬПЯШАЙЦЕСЯ!

Умовы разьмяшчэньня абвесткі ў газэце

Пералічыце 400 рублёў праз пошту пераводам на разьліковы рахунак рэдакцыі: рэдакцыя газэты «Навінкі», р/р 3012201400013, Купалаўскае аддзяленьне ОАО «БелінвестБанк», г.Менск, код 481. На зваротным баку блянку паштовага пераводу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запішыце дакладна й чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і абавязкова дадайце сказ: «За рэклямныя паслугі».

Мы ідзем глядзець Савіцкага

У славутага прыдворнага майстра пэндзлю – юбілей

Міхаіл Савіцкі даўно ўжо стаў клясыкам у беларускім выяўленчым мастацтве. Таму выстаўляцца ягоныя карціны павінныя ў тых залях, дзе вісяць партрэты Радзівілаў і фэадалаў мінулых эпох. Прынамсі галерэя партрэтаў акадэмікаў ад У.Ігнатоўскага да М.Вайтовіча цалкам вытрыманая ў жанры прыдворнага жывапісу часоў перадвіжнікаў. Не выклікаюць пратэстаў і партрэты Пушкіна зь Міцкевічам – іконы, якія трэба было ўшаноўваць у іхны юбілейны год. І «Партызанская мадонна» – даніна свайму часу і сваім мітам, хаця слова «партызан» мае больш шырокую канатацыю, чым гэта было прынята ў савецкія часы. Мадонна – гэта жонка гэткага партызана, якая, нягледзячы на цяжкія акалічнасьці, вырашыла выканаць абавязак перад прыродай і нарадзіць дзіця. Асабліва вылучаецца на выставе карціна «Забойцы Праўды», якая нагадвае біблейскі сюжэт «Сусана і старцы» – распранутая бялявая кабета ў празрыстым пеньюары стаіць аточаная агіднымі чарнявымі і пляшывымі суб'ектамі зь вялікімі шнобэлямі, якія нагадваюць сіёнскіх мудрацоў і жыдамасонаў. Міхаіл Савіцкі бачыў шмат людзей неарыйскага тыпу сярод вязьняў канцэнтрацыйнага лягеру Бухенвальд, зь якімі ён матаў тэрмін у 1944-45 гадах. Зрабілі гэтыя унтэрмэншы мастаку нешта прыкрае, і ён вырашыў адпомсьціць пасьля доўгага часу, ці палітычная кан'юнктура раставіла былых сукамэрнікаў па розныя бакі лініі агню – застаецца толькі здагадвацца.



Тайная Дактрына БНФ

Прызнацца, *Навінкі* даўно зарэкліся пісаць пра акцыі Маладога Фронту, аднак бюлетэнь *Навіны БНФ* №4, што выпадкова трапіў нам на вочы, прымусіў нас забраць словы назад. Дакладней, гаворка ідзе пра надрукаваную на яговых старонках г.зв. «Канцэпцыю кампаніі «Беларусь у Эўропу» – «фірмовай маладафронтаўскай фішкі, якая гэтымі днямі набірае абароты па ўсіх рэгіёнах. Зьмест канцэпцыі настолькі узьняў наш нацыянальны імпэт, што мы таксама, не хістаючыся вырашылі прыяднацца да нястройнага рову маладафронтаўскіх галасоў «Беларусь у Эўропу!». Няхай нашай сьціплай лептай у гэта «эфэктнае аптымістычнае і відовішчнае» мерапрыемства будзе даслоўная перадрукоўка некаторых фрагмэнтаў канцэпцыі. Мы верым, што, прачытаўшы ўрыўкі, нейкі цёмны, зачмуханы афіцыйны агітпропам беларус скіне зь сябе мэнтальныя кайданы прыгнёту і ўвальецца ў наш маратон. Такім чынам, пачынаем наш візуальны інструктаж.

Магчымыя прывязкі (акцыяў – ад рэд.) на месцы й асацыяцыі: масты й брамы, консульствы, мытні, помнікі, аб'екты эўрапейскага кшталту, вуліцы, якія вядуць на Захад.

Вулічныя маратоны (абыходы, эстафэты, маршруты, прабегі па маладзёвых асяродках, у цэнтры або вакол гораду, або з усходу на захад).

Дыскусіі і гутаркі на тэмы «Эўрапейскі Барысаў», «Эўрапейская гісторыя», «Эўрапейскі этыкет» і г.д.

Вечарыны (дыскатэкі, шоў, адзначэньні) – з эўрапейскімі конкурсамі, эўрапейскай паэзіяй, гульнямі, Інтэрнэтам, салодкім сталом – усё, што прыдумаеце.

Касьцюмаваньні – апранаюцца строі розных народаў і краінаў Эўропы – ад Беларусі да Гішпаніі, прычым арыентавацца варта ня столькі на фальклер, колькі на стэрэатыпы, вобразы й характары.

Сымбалі кампаніі можна выяўляць і на снезе, лёдзе, асфальце. Як арыгінальны від – папулярнае зараз стварэньне сьнегавых і лёдавых скульптураў (пакуль маразы) на эўрапейскія й беларускія тэмы.

Акцыі эўрапейскай чысьціні – прыбіраньне (па дамове з ЖЭСам і/ці самастойна) вуліцаў, плошчаў і паркаў зь беларускімі ці эўрапейскімі назвамі, навакольляў, знакавых будынкаў і храмаў.

Вельмі важна памятаць пра хрысьціянскі, духовы сэнс Дня Сьвятога Валянціна (і ня скатвацца да прэзэрватываў, масавых пацалункаў да іншай разбэшчанасьці).

І, нарэшце, «палаючае сэрца» – вечаровая акцыя: моладзь выстройваецца ў форме сэрца (або кола эўрапейскіх зорачак) у знакавым месцы гораду або перад шматпавярховікамі (лепш відаць і фатаграфаваць).